*России, то меня больше всего умиляет одна вещь: до чего это была богатая, изобильная, роскошная страна*... («Дюжина ножей в спину революции). Россия определяется эпитетами старая, богатая, изобильная, роскошная, новая, великая, свободная, русская (*Ах, как хорошо в русской России...* «Дюжина ножей в спину революции»). Интересно, что в философской мысли того времени (в частности у Н. Бердяева) также существовало представление о России как о живом существе, о самостоятельном, активном начале [5]. Следует отметить богатство метафоры, представляющей революцию в тексте сборника. Революция предстает как неодушевленный предмет (ракета, лицо), стихийное явление (гроза, молния). Революция также олицетворяется, имеет человеческое тело: *Взял да и воткнул в спину революции ножик, да и не один, а целых двенадцать!*; предстает как субъект действия: *Революция [...] сбрасывает гнет*; как объект деятельности человека: *Правда, сейчас еще есть много людей, которые, подобно плохо выученным попугаям, бормочут только одну фразу: – Товарищи, защищайте революцию!* А. Аверченко подчеркивает процессуальность революции (*Это – переворот; Революция уже кончилась*), в том числе переход ее в другое состояние (*...Переходит в сатанинский вихрь разрушения*). Концепт *революция* тесно связан с концептом *война*, так как в реальности эти явления взаимосвязаны: революция обусловлена мировой войной и вызывает гражданскую войну. Показательно, что лексема война в творчестве А. Аверченко мало представлена. Но и по отдельным контекстам (из сборника памфлетов «Дюжина ножей в спину революции») можно судить о неприятии войны писателем: *А вот и ужасная война тает, как кусок снега на раскаленной плите; мертвые встают из земли и мирно уносятся на носилках обратно в свои части.* Данный контекст представляет интересную авторскую репрезентацию концепта *война* как вещества (куска снега, который тает). Таким образом, анализ показывает, что для ключевых концептов художественной прозы А. Т. Аверченко характерна как общеязыковая, так и весьма интересная индивидуально-авторская репрезентация. Следует отметить частое опредмечивание абстрактных имен в художественных текстах писателя.

Литература


1 Национальный корпус русского языка – [Электронный ресурс] – Режим доступа http://search.ruscorpora.ru

2 Чумак, О. С. Автореферат. Корреляция концептов «жизнь» и «смерть» в идиостиле Б. Л. Пастернака (на материале романа «Доктор Живаго») / О. С. Чумак – [Электронный ресурс] – Режим доступа http://31f.ru/dissertation/page,15,173-dissertaciya-korrelyaciya-konceptov-zhizn-i-smert-v-idiostile-b-l-pasternaka.html

3 Википедия – [Электронный ресурс] – Режим доступа http://ru.wikipedia.org/

4 Буянова Л. Концепт «душа» как основа русской ментальности: особенности речевой реализации. – [Электронный ресурс] – Режим доступа http://www.relga.sfedu.ru/

5 Концепт «Россия» в философской картине мира Н. А. Бердяева. – [Электронный ресурс] – Режим доступа http://www.alba-translating.ru/index.php/ru/articles/berdyaev.html


УДК 811.161.3’374:398.9

А. М. Палуян

## Як дбаеш, то і павагу маеш: асаблівасці нацыянальнага характару беларусаў у прыказках і прымаўках

В статье на материале пословиц и поговорок выявляются характерные черты национального характера белорусского народа, моральные качества и жизненные приоритеты.

Як слушна адзначае Т. Сухоцкая, «на шляху пошукаў вырашэння глабальных праблем сучаснай цывілізацыі чалавецтва імкнецца да яднання і згоды. Адначасова ў гэтых працэсах прасочваецца тэндэнцыя захавання народамі сваёй індывідуальнасці і непаўторнасці» [4, 32]. Гістарычны лёс Беларусі склаўся такім чынам, што ёй на працягу многіх

стагоддзяў прыйшлося зведаць перыяды як росквіту, так і заняпаду, штучанага падаўлення нацыянальнай самабытнасці, адмаўлення багатай духоўна-культурнай спадчыны. Аднак і ў самых неспрыяльных умовах беларускі народ ніколі поўнасцю не страчваў свайго нацыянальнага аблічча, захоўваў свае адметныя рысы і якасці. «А дзеля таго каб глыбей асэнсаваць гістарычны шлях Беларусі, больш грунтоўна пазнаць саміх сябе, неабходна ў першую чаргу зразумець і ўсебакова даследаваць… народную душу, дух народа, альбо яго адмысловы нацыянальны характар» [2, 3], пад якім мы разумеем «своеасаблівы набор, сукупнасць розных псіхалагічных рыс і якасцей, уласцівых большасці прадстаўнікоў якога-небудзь народа» [2, 3]. Асаблівасці нацыянальнага характару прама ці ўскосна адлюстроўваюцца ў найбольш распаўсюджаных рысах паводзін пачуццяў і перажыванняў пераважнай часткі людзей, якія адносяцца да аднаго народа. Паходжанне, этнічнае развіццё і спецыфіка беларускага народа – праблемы дастаткова складаныя і надзвычай важныя. Каб зразумець народ, «трэба ведаць яго вытокі, карані, неабходна раскрыць і зразумець, як самі беларусы сябе ўспрымаюць, якімі рысамі і ўласцівасцямі яны надзялілі і надзяляюць членаў свайго этнасу» [1, 86] .

Мэта нашага даследавання – выявіць асноўныя рысы, уласцівыя беларускаму народнаму характару і адлюстраваныя ў прыказках і прымаўках, паколькі гэтыя малыя жанры фальклору з’яўляюцца адбіткам ладу жыцця і характару народа, яго гісторыі, маралі, псіхалогіі, нацыянальных традыцый і звычаяў, этнічнага быту і тэмпераменту. Павучальныя і мудрыя сваёй маральна-практычнай філасофіяй прыказкі і прымаўкі найбольш трапна перадаюць неабходную інфармацыю і, у адрозненне ад, напрыклад, легенд і казак, ім не ўласцівы элементы фантастыкі, паколькі яны грунтуюцца на сінтэзаванні рэальных з’яў, тыпізацыі канкрэтных фактаў з жыцця грамадства [5, 13]. Асноўнай крыніцай іх узнікнення былі разнастайныя жыццёвыя назіранні, гістарычныя сітуацыі, рысы характару людзей. У якасці фактычнага матэрыялу мы выкарысталі кнігу З. Санько «Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем».

Якія ж рысы беларускага характару праяўляюцца ў прыказках і прымаўках?

Перш за ўсё, беларусам уласціва ўменне і жаданне працаваць, і не абы-як, а добра: *хто дбае, той і мае; хто полю годзіць, у таго жыта родзіць; дзе гаспадар ходзіць, там ніўка родзіць; пільнуй гаспадаркі – будуць у гаршку скваркі; якая справа, такая і слава; як дбаеш, то і павагу маеш.*

Беларус разумеў, што, каб праца давала добры вынік, неабходны пастаянны клопат, цярпенне і настойлівасць: *каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці; каб вады напіцца, трэба ёй пакланіцца; па дарозе ідучы, грыбоў не назбіраеш; цярпі, Зося, так прыйшлося; вялікае дрэва паволі расце; будзе час, будзе і квас, не ўсё зараз; гаспадарка – клапатарка.*

Цаніў беларус не толькі фізічную, але і інтэлектуальную працу: *трэба розум надтачыць, дзе сіла не возьме; дзе не можна сілаю, там бяры здогадам; чаго не можаш узяць рукамі, хапай галавою; дзе сілаю не зробіш, то спосабам; не сілай ухапі, а розумам; і да булавы трэба галавы; у добрай галавы сто рук.*

Беларусы здаўна аддавалі перавагу працы перад адпачынкам: *перш папрацуй, а тады патанцуй; была нядзеля – і мы дудзелі, цяпер серада – працуй, грамада; калі – на лянок, а калі – у танок; гульня, ды не штодня; годзе цалавацца, пара і на хлеб старацца; адклад не йдзе ў лад; лепей цяпер, чым у чацвер; сон на заўтра адкладзі, а справу сёння зрабі.*

Уласцівы беларусам і прадбачлівасць, запаслівасць, беражлівасць, ашчаднасць: *на свята думай пра будзень, а ўлетку пра зіму; запас бяды не чыніць; няхай будзе – есці не просіць; хто жыве без запасу, той гіне без часу; добра, у каго запас на ліхі час; зерне да зерня, будзе поўная мерня; колас да коласа – сноп будзе; рубель з граша паходзіць; па кропельцы – рэчка, па травіцы – копка, а па копцы – стог; з малога дойдзе да вялікага.*

Нягледзячы на не заўсёды спрыяльныя ўмовы існавання, беларусы не гублялі жыццёвага прагматызму, непераадольнага аптымізму і настойлівасці ў дасягненні мэты: *прыйдзе, тата, і наша свята; будзе і на нашай вуліцы кірмаш; загляне сонца і ў наша аконца; прыйдзе тая нядзеля, што будзе і маё вяселле; калісьці і наш бог праспіцца; хто пытае, той не блудзіць, хто шукае, той знаходзіць; каму ў голаў зайдзе, той і за печчу*

*знайдзе; пашукай, як трэба, то і знойдзеш, што трэба; хто моцна жадае, той і мае; шукай, дык знойдзеш.*

Уласцівы беларусам пачуццё раўнавагі, залатой сярэдзіны, аб'ектыўнага стаўлення да жыцця: *не будзь горкі – праклянуць, не будзь салодкі – пракаўтнуць; будзеш горкі – траплююць, а салодкі – праглынуць; на ўсё свой час; усё добра, што ў меру, а што зашмат, тое не ў лад; праз меру і свінні не ядуць; шырокая лыжка рот дзярэ; што задужа – не здарова; усё добра ў пару; свой час ягадзе, свой баравіку; не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра; завіхайся, але не спяшайся.*

Беларус быў перакананы, што жыццё нялёгкае, усяго ў ім бывае: *век звекаваць – усяго спазнаць; на год сем прыгод, а на вяку – без ліку; здараецца на вяку і па спіне і па баку; на вяку, як на палосцы-шнурку, усяго трапляецца – і кукалю, і пшаніцы; жывучы, усяго давядзецца; век звекаваць – не пальцам паківаць; жыццё пражыць – не песеньку спець.*

Не ставілі ў віну чалавеку заможнасць, разумелі цану грошай: *калі маеш грошы, то не будзеш хадзіць босы; калі ёсць у мяшку, то будзе і ў гаршку; без нястачы пражывеш, калі грошай нажывеш; за свае грошы хоць дзе харошы; хто мае грошы, той добры і харошы; з грашыма ўсюды добра; абы грошы, усё будзе; грошы цела не пякуць; з прыбытку бяды няма; з прыбытку галава не баліць.* Але ў той жа час нашы продкі разумелі, што не ўсё можна набыць за грошы: *на таргу долі не купіш; у судзе праўды не знойдзеш, а на рынку долі не купіш; без шчасця не будзе багацця, а за грошы шчасця не купіш.*

У складаных жыццёвых варунках неабходны былі і такія якасці, як кемлівасць, стрыманасць, нават хітрасць: *кожны стралец сваю стрэльбу хваліць; кожны цыган сваю кабылу хваліць; на кірмашы і бык цельны; не ганячы, не купіш, не хвалячы, не прадасі; трымай язык на прывязі; маўчы дый мак таўчы; маўчы як жаба ў карчы; маўчы і дыш, дык будзе і барыш.*

Цаніліся і такія якасці характару, як смеласць, адвага, рызыка: *у каго адвага, у таго й перавага; адвага – не знявага; адважны нідзе не загіне; адвагаю і пекла пяройдзеш; бой адвагу любіць; смеламу Бог памагае; хто не рызыкуе, той не мае.*

Да станоўчых рыс характару беларусаў неабходна аднесці і адказнасць за свае ўчынкі, павагу да сябе і да іншых: *што вінен, аддаць павінен; круці не круці, што трэба заплаці; шануйся замалада – не напаткае бяда; шануй рапуху у садзе, а сябе ў грамадзе; шануй сябе, то і людзі шанаваць будуць; слова давай, дык яго і трымай; што сказаў, тое святое; будзь свайму слову гаспадар.*

Беларусам уласціва памяркоўнасць, павага да тых, хто думае інакш: *дзеду міла, а ўнуку гніла; каму – як балота, а каму – як залота; хто каб салоўку паслухаць, а хто дзеркачовай (драчовай) песні рад; хто любіць гарбуз, а хто агуркі; адзін хоча сёе, другі – тое.*

Адной з вызначальных рыс характару беларуса з'яўляецца павага як да землякоў, так і да іншых народаў і іх звычаяў: *у кожнага кавалера свае манеры; кожны кравец сваім кроем кроe; усякі чалавек сваім стылем жыве; што ні край, то свой звычай; што старана, то навіна; іншы горад – іншы гонар; кожнае сяльцо мае сваё нараўцо; што ні хата, то свой комін; з сваёю цаною на кірмаш не едуць; у чужую парафію са сваім звычаем не прыходзь; у чужой бажніцы свечак не папраўляй; у студню вады не льюць, а ў лес дроў не возяць.*

Беларусы заўсёды цанілі шчырасць у адносінах: *чаго не хочаш самому, не чыні другому; што сабе не міла, таго і другому не зыч; не рабі другому, што не люба самому*; былі гасціннымі і шчодрымі: *што хата мае, тым і прымае; чым хата багата, тым і рада; хоць я небагаты, а з гасцей рады; частавалі, чым мелі, весялілі, як умелі; не дарага ежка, дарага пацешка; даражэйшае не сняданне, а прывітанне; не частуй мяне ні піўцом, ні вінцом, а прывітай шчырынькім слаўцом; піццё – смяццё, пасядзёнка дарага; ці з перцам, ці не з перцам, абы са шчырым сэрцам*; не любілі сваркі: *лепей сем разоў змарыцца, як адзін раз пасварыцца; лепей драўляная згода, чымся залатая сварка; святы спакою, лепей з табою; лепей не даеўшы, ды спакойна пасядзеўшы.*

Беларусам уласцівы калектывізм, адлюстраваннем якога з'яўляюцца распаўсюджаныя на Беларусі каляндарныя святы і абрады, у якіх бралі ўдзел амаль усе жыхары ад ма-

лых да старых, а таксама такія старадаўнія народныя звычаі, як талака, сябрына, бонда: *грамада – вялікі чалавек; моцны статак чарадою, а людзі грамадою; адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не тухнуць; адзін дуб у полі – то не лес; адна пчала мёду не наносіць; на людзях і плакаць лягчэй; а памрэ Аўдзей, дык жа між людзей; чалавек без сяброў, што печ без дроў; няма грошай – не бяда, як сяброў грамада; добра там жывецца, дзе гуртам сееццa і жнеццa; зычлівага прыяцеля ў няшчасці пазнаюць.* І ў той жа час пад уплывам палітычных, прыродна-геаграфічных, сацыяльна-дэмаграфічных фактараў жыхары Беларусі рассяляліся кампактнымі супольнасцямі і рысы “аўтаномнасці”, індывідуалізму маглі пераважаць: *не твая палоса – не сунь носа; дай спакой рэчы такой, то суседская справа; у чужое проса не тыч (не ткні) носа; не лезь, куду цябе не клічуць; цікаўнай Амілі нос прышчамілі; на цікаўныя вочы парушынкі падаюць.*

Вызначальнымі для беларускага характару з’яўляецца пачуццё асабістага гонару і годнасці: *і мая доля не шчарбатая; і мой квасок не з трасок; і мы не з гліны злепленыя; і мы не абораю хлеб кроім; і у мяне рукі ёсць; і мая ж душа не лішняя; і мая хата не карчма.* Не заўсёды ён прабачыць і крыўду: *будзе й на крапіву мароз; няхай паны не радуюцца – прыйдзе й на іх радуніца; цяпер нас катуеш, можа, калі і сам патанцуеш; сірочыя слёзы дарма не мінуцца; тое з вадою не збяжыць*; верыць у перамогу справядлівасці: *усё мінецца, а праўда застанецца; праўда спраўдзіць; праўда, як алей, выйдзе наверх,* але тым не менш часта іранічна ставіцца да пошукаў справядлівасці ў судзе: *на рынку долі не купіш, а ў судзе праўды не знойдзеш; у каго капшук паўнейшы, у таго і суд спраўнейшы; была б спіна – знойдзецца віна; без сівухі і суддзі глухі.*

Шануе і любіць беларус свой край, а родную хату лічыць найлепшым месцам на свеце: *жыве кулік, дзе прывык, і кожны сваё балота хваліць; у сваім гародзе роўны ваяводзе; на сваім падворку і сабака адважнейшы; на сваім сметніку і верабей гаспадар; на сваім сметніку і певень смелы; у сваёй хаце і вуглы памагаюць; у сваёй хаце і качарга памач; у сваёй хаце і дзіркі грэюць; лепш у сваёй хатцы, як у чужым палацы; няма лепшай рэчы, як дома на печы; дома край як рай; у сваёй хатцы добры і сабачцы.*

Асаблівасці светапогляду і характару беларусаў праяўляюцца і ў іх адносінах да рэлігіі, царквы, рэлігійных абрадаў, увогуле існавання Бога: *дасць бог дзень – дасць і спажытак; даў бог стан – дасць і жупан; бог бачыць з неба, што каму трэба; бог ведае, хто што робіць і хто як абедае; чалавек думае, а бог робіць; стралец (чалавек) страляе, а бог кулі носіць; калі бог не дасць смерці, дык не возьмуць і чэрці; як бог дапусціць, то й святыя не абароняць.* Як бачым, нашы продкі адносіліся да Бога з павагай, спадзяваліся на яго дапамогу, але ім не была ўласціва сляпая, ўсёпаглынальная вера ў поўную справядлівасць і ўсёмагутнасць Бога: *сцеражонага бог сцеражэ;Божа памажы, але і сам падбяжы (але і сам не ляжы); на Бога спадзявайся, але і сам старайся; працуй, нябожа, то і Бог паможа; чакай збавення з неба, а тым часам і хлеба трэба.*

Па-філасофску адносіўся беларус да смерці: *смерці не заперці, калі трэба памерці; ад смерці не выкруцішся, не вымалішся; смерць не ручаіна – не пераскочыш; ад смерці ніхто не збароніць; смерці ў бутэльку не заткнеш.*

Набожнасць беларусаў, іх вера ў вышэйшыя духоўныя каштоўнасці паўплывалі і на характар сямейных узаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі: *малыя дзеткі – малыя і бедкі; малыя дзеці – галава баліць, вырастуць – сэрца; малыя дзеці – рукі баляць, вялікія – сэрца баліць*; мужам і жонкай: *мужык і жонка – найлепшая суполка; гаспадар і баба – адна рада; Антось ды Тадора – што лапаць і абора; які Хомка, такая і яго жонка; які едзе, такую вядзе*; сваякамі: *свой над вірам патрасе, але ў вір не панясе; свае дзесяць разоў пасварацца і паміраццa.* Шматлікія прыказкі і прымаўкі вызначаюць ролю бацькоў у жыцці і лёсе дзяцей: *якая матка, такое і дзіцятка; якое дрэва, такі і клін, які бацька, такі і сын; які млын, такі і ставок, які бацька, такі і сынок; яблычак ад яблыні далёка не адкочваецца.* У беларускай культурнай традыцыі трывала прысутнічае вобраз маці – апякункі-заступніцы, бескарыслівай, чуйнай, чуллівай жанчыны: *птушка радая вясне, а дзіця – мамцы; дзіця да маці, як краска да сонца; нідзе няма лепш, як у сваёй маці; няма лепшай*

*хатkі, як ў роднай маткі; ніхто так не спагадае, як родная маці; матчыны рукі заўсёды мяккія; у сваёй маці добра і ў пасцелі паляжаць.*

Нашы продкі з павагай ставіліся да ролі жонкі ў сям'і, лічылі яе памочніцай і дарадчыцай мужа: *добрая жонка – дома рай, благая – хоць ты цягу дай; добрая жонка дом зберажэ, а ліхая рукавом растрасе; хто жонку добрую мае, той гора не знае; там і Бог раюе, дзе жонка мужыка шануе.* Пры выбары жонкі цанілі, перш за ўсё, не прыгажосць, а працавітасць: *выбіраюць не на йгрышчы, а на ржышчы; не выбірай дзеўку ў карагодзе, а шукай у агародзе; не глядзі на мяне, у касцёл ідучы, а глядзі на мяне, лён тручы; жонку выбірай і вачыма, і вушыма.* Але не забывалі і пра абавязкі мужа: *двор без гаспадара плача; без гаспадара і грошы – чарапкі; няма Саўкі – няма ўпраўкі; як гаспадар ёсць у хаце, дык усё будзе добра дбаці.* Ён не абавязкова павінен вылучацца знешняй прывабнасцю, галоўнае, каб быў надзейным і гаспадарлівым: *хоць лядашчы мужычок, ды затулле маё: завалюся за яго, не баюся нікаго; сякі-такі, абы быў, абы хлеба зарабіў; няхай мужык як шкарпэтка, абы жонка як кветка; мужык хай будзе як долата, абы ты за ім была як золата; мужык як варона, ды ўсё жонцы абарона.*

Беларус у паўсядзённым жыцці надаваў вялікае значэнне не толькі працы, але і каханню: *не памогуць і чары, як каму хто не да пары; упрошваючы не намілуешся; даганяючы не нацалуешся; сілаю не быць мілаю; без сонейка свету не быць, без мілага нельга жыць.*

Такім чынам, мы можам зрабіць вывад, што ў іерархіі каштоўнасцей у беларускай культуры «перавага аддаецца гаспадарскай парадыгме… Галоўным культурным героем … з'яўляецца дбайны гаспадар, які вылучаецца пачуццём адказнасці ў яго стаўленні да зямлі і людзей» [4, 32-33].

Беларусы здаўна асуджалі дрэнныя звычкі, якія перашкаджаюць чалавеку нармальна жыць і працаваць:

– зайздрасць: *чужая доля пад бокам коле; на чужое дабро вочы гараць; ласы на чужыя кілбасы; у чужых руках пірог вялікі; у суседа ўсё лепшае;*

– крывадушнасць: *добра гаворыць, ды нядобра творыць; мякка сцеле, ды мулка спаць; на вуснах - мёд, а на сэрцы – лёд; у вочы ліском, а за вочы пяском;*

– злачынствы: *калі хочаш прапасці, пачні (ідзі) красці; крадзеным падавішся; чужое не тучыць, бо сумленне мучыць; ад зладзейства не разжывешся; хто чужога жадае, часта сваё пакладае; не ганіся за чужым, не трэба будзе плаціць;*

– п'янства: *хто па гарэлку часта ходзіць, той сам сабе шкодзіць; хто п'е, той доўга не жыве; гарцы ўвядуць у старцы; чарка і сварка да добрага не давядуць; чорт душу аддаў, бо часта ўгару заглядаў; вада жывіць, а гарэлка губіць;*

– недахоп розуму, інтэлекту: *за дурной галавой нагам неспакой; скупы двойчы плаціць, а дурны двойчы ходзіць; галава нагам зладзей; даў бог дурню хлеба, ды той не умеў спажыць як трэба;*

– ганарлівасць: *чужыя грахі перад вачыма, а свае за плячыма; чужое бачыць пад лесам, а свайго не бачыць і пад носам; у чужым воку і парушынку ўгледзіць, а ў сваім і калоды не пабачым; свайго горба ніхто не бачыць;*

– пахвальбу: *хто сам сябе хваліць, няхай таго пярун спаліць; пахвальба – малайцу згуба; чужая пахвала як гром грыміць, а самахвальства смярдзіць; не хвалі сябе, няхай людзі пахваляць;*

– пераборлівасць: *з вялікага гурту выбраў сабе курту; з вялікай выбірачкі выбіраюць гарачкі; з вялікай перабірачкі дастанеш балячкі; дзе вялікія выборы, там пасталы і аборы; пераборны заўсёды галодны; не перабірай, а то скулу схопіш;*

– пустаслоўе: *языком у Вільні, а галавой за печчу; слоў – на мех, а спраў – на смех; каб так смыкам, як языкам; гультай не чалавек, балбатун не гаспадар;*

– хлусня: *хто раз схлусіў, таму ніколі веры няма; болей не ашукаеш, як толькі раз; ад хлусні не мруць, толькі веры болей не даюць; адзін раз зманіш – другі не павераць;*

– грахоўнасць, распуста: *не заглядайся на чужык жонак: не скасееш, дык здурнееш; сам сябе загубіш, як чужую жонку прыгалубіш; што цела любіць, тое душу губіць;*

– гультайства: *хто замаладу не працуе, той на старасць жабруе; гульня ў маладосці дае хваробу на старыя косці; змоладу банкетавалі, а пад старасць жабравалі; не хочаш у маладосці працаваць, будзеш на старасці з торбачкай танцаваць; на яду мастак, а на работу так-сяк; рабіць наш Васіль не мае сіл, а на клёцкі ў малацэ – за чацвярых валачэ;*

– нявыхаванасць: *пусці свінню пагрэцца, то і самому не будзе дзе дзецца; упрасілі злыдні на тры дні, а за тры гады не выжывеш; упрасіўся на парог, а і з печы не згоніш;*

– скупасць: *скупому два разы баліць; абыякі двойчы робіць, а скупы тройчы траціць (плаціць); скупы і з камара кроў высмакча; скнарыца і за трэску пасварыцца; скупы збірае, а чорт мех шые*.

Наогул, нашы продкі лічылі, што характар благога чалавека не зменіш: *не чакай падзякі ад прыблуднага сабакі; благога як ні кармі – благім будзе; котку лашчыш, а яна кіпці выпускае; воўка як ні гадуй, усё ў лес пазірае; гарбатага хіба труна выпрастае; крывога дрэва не выпрастаеш; з дугі аглоблі не зробіш*.

З разгледжаных намі прыказак і прымавак беларус паўстае разважлівым, шчырым, гасцінным. Ён умее і любіць працаваць, спачувае і дапамагае тым, хто мае ў гэтым патрэбу, аб’ектыўна ставіцца да жыццёвых падзей. Адрознівае яго і назіральнасць, якая дапамагае ў запамінальнай формае прыказак і прымавак перадаць мудрасць сучаснікам і нашчадкам.

Для таго, каб дасягнуць поспехаў у эканамічным, сацыяльна-палітычным і духоўна-культурным развіцці, нам неабходна “больш глыбока зразумець саміх сябе, сваё прызначэнне ў гэтым свеце, паспрабаваць усё ж зазірнуць у патаемныя глыбіні народнай душы, высветліць сутнасць, разгадаць яе шматлікія таямніцы” [2, 45].

Літаратура

1 Бачыла, І. Вобраз беларуса праз прызму малых жанраў фальклору /Фальклярыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. Вып. 8 /пад нав. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск : Права і эканоміка, 2011. – С. 82 – 87.

2 Дубянецкі, Э. С. Таямніцы народнай душы: Кн. для вучняў / Э.С. Дубянецкі. – Мн.: Народная асвета, 1995. – 47 с.

3 Санько, З. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем / З. Санько. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 218 с.

4 Сухоцкая, Т. Агульначалавечы сэнс і нацыянальная адметнасць духоўнага ідэалу беларускай культуры /Фальклярыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. Вып. 8 /пад нав. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск : Права і эканоміка, 2011. – С. 32–33.

5 Янкоўскі, Ф. М. Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі / Ф. М. Янкоўскі. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1957. – 451 с.

УДК 81’373.211(476+470+571)

К. Л. Хазанава

## Асаблівасці намінацыі сядзібнага комплексу на тэрыторыі беларуска-расійскага памежжа

У артыкуле даследуюцца назвы частак традыцыйнага жылля, зафіксаваныя на тэрыторыі беларуска-расійскага памежжа, выяўляюцца асаблівасці наймення хаты, некаторых яе частак, гаспадарчых пабудоў у Добрушскі раёне Гомельскай вобласці, даследуецца семантычнае напаўненне ўказаных лексем і ўплыў на іх функцыянаванне рускай мовы.

Кожны народ за часы свайго існавання накапіў каштоўную спадчыну. Усходнія славяне ў гэтых адносінах не выключэнне. Разам з багатым па колькасці і разнастайным у жанрава-стылявых адносінах фальклорам, разам з велізарнай скарбонкай сямейна-